# Жыць – гэта думаць

Захацелася скінуць з сябе салодкую няволю рыфмаў, гэты панцыр чарапахі. Гэтая кніжка — яшчэ не развітанне, не запавет, але падвядзенне вынікаў. Кнігу Самэрсета Маэма “Падводзячы вынікі” я перачытвала некалькі разоў. Ёсць іншыя кніжкі, шмат падобных кніг пра душу творчасці, і некаторыя з іх я чытала, але ў той патрэбны час трапіў Маэм.

Цяпер я зразумела, што пра людзей, якія істотна паўплывалі на мой лёс, у вершах не напішаш.

Дасканалай мовай прозы я не валодаю. Таму атрымаліся эсэ.

Пакуль я толькі думала пра гэтую кніжку, у ёй мала месца знаходзілася для маёй асобы. Сяргей Грыневіч спытаў: “Вы пішаце кнігу, дзе Вы будзеце галоўным героем, а я — персанажам?” Я адказала: “Не. Вы, надта важныя ў маім жыцці людзі, будзеце маімі героямі, а я буду збоку”…

Дакладна так у мяне не атрымалася.

І ўсё ж, у маёй жыццёвай прыгодзе паэткі найважнейшымі з'явамі былі людзі, якія мяне любілі, якіх я любіла. Я яшчэ не пра ўсіх паспела апавесці. Думаю, я працягну свой прыгожы праект у будучым часе, таму што каталіцкі духоўны часопіс “Наша вера”, які стаў часопісам майго лёсу, не адмаўляецца публікаваць мае эсэйкі.

Праца настаўніцы беларускай мовы, музейнай збіральніцы, паэткі, як і праца пастушкі ў дзяцінстве, — гэта ўсё дзейнасць грамадская. Поспех залежыць ад людзей, якія прыходзяць дапамагаць па добрай волі. Да іх вяртаюцца мае думкі. Нешта ёсць паміж людзьмі, нябачнае цялеснаму воку, але бачнае душы, — гэта вера. Калі мне была вельмі патрэбна дапамога, я пачала маліцца да сяброў, якія нядаўна памерлі. Сябра Аляксандр Ліпень знайшоў мне свайго вучня Казіміра Місюру, а Казімір знайшоў маю аднакурсніцу па педвучэльні Элю Багдановіч. Да іх мяне завёз Міхал Карневіч. Яны сваёй сяброўскай увагай вывелі мяне з крызісу…

Вядома, гэтая кніжка няроўная. Я не ўсюды дала рады сваім эмоцыям. На мяжы паміж паэзіяй і прозай, калі ўдаецца заскочыць за далягляд думкі, дзе пачуццё і думанне зліваюцца ў адно, мае эсэ атрымаліся.

“Заходзьце да мяне, хто ў смутку, душа кніжкі заўсёды адчынена”…

**Данута Бічэль**